View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE



***Г.В. Янкута***

# МАСТАЦКАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ФЕМІННЫХ МАДЭЛЯЎ У РАМАНАХ МАРГАРЭТ ЭТВУД

Гісторыя гендарных даследаванняў як міждысцыплінарнай навуковай галіны, што факусуецца на поле як сацыякультурным канструкце, пачалася ў 1960-я гг. разам з ростам актыўнасці жаночых рухаў, што змагаліся за роўныя правы жанчын і мужчын. Гендарны падыход у літаратуразнаўстве прадугледжвае вывучэнне рэпрэзентацыі гендарных роляў і стэрэатыпаў (маскулінных і фемінных) у мастацкім тэксце. Творы канадскай пісьменніцы Маргарэт Этвуд (нар. у 1939) у гэтым плане – вельмі плённы матэрыял для даследаванняў. Творчы шлях пісьменніцы пачаўся ў 1960-х гг. адначасова з уздымам другой хвалі фемінізму (сама М. Этвуд сцвярджае, што феміністскі рух не паўплываў на яе першы раман “Ядомая жанчына”, што выйшаў у 1969 г., бо яна пра гэты рух тады яшчэ нічога не ведала), і многія ангельскамоўныя літаратуразнаўцы разглядаюць яе творчасць з гледзішча феміністкай крытыкі. Цікавасць М. Этвуд да вострых сацыяльных і палітычных праблем (у тым ліку да праблемы полу як інструмента стратыфікацыі) і яе мастацкае асэнсаванне пытанняў улады, гвалту, свабоды і інш. праз прызму жаночага досведу робяць яе творы важнай крыніцай для вывучэння трансфармацыі гендарнай паэтыкі[17] ў літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI ст. У дадзеным артыкуле будуць разглядацца тры творы М. Этвуд – раманы “Гісторыя Служанкі” (*The Handmaid’s Tale*, 1985) і “Яна ж Грэйс” (*Alias Grace*, 1996) і аповесць “Пенелапіяда” (*The Penelopiad*, 2005), – напісаныя аўтаркай з прамежкам у 10 гадоў, што дае магчымасць прасачыць дынаміку развіцця спосабаў мастацкай рэпрэзентацыі фемінных мадэляў у творчасці пісьменніцы.

Галоўныя героі ўсіх трох раманаў – як і большасці раманаў М. Этвуд – жанчыны. У рамане “Гісторыя Служанкі” гэта Служанка Фрэдава (*Of fred*, то бок тая, што належыць Фрэду), жанчына, якая жыве ў новым дзяржаўным утварэнні Галаад, дзе ўсталявалася тэакратычная ваенная дыктатура, і мусіць выконваць ролю сурагатнай маці ў сям’і чыноўніка высокага рангу, Камандора Фрэда. У рамане “Яна ж Грэйс” гэта падазраваная ў падвойным забойстве, здзейсненым у Канадзе ў 1843 г., Грэйс Маркс, рэальная гістарычная асоба, чыя віна так і не была аспрэчаная ці даказаная; значную частку жыцця яна правяла за кратамі. У аповесці “Пенелапіяда” гэта жонка старажытнагрэцкага героя Адысея Пенелопа, якая дваццаць гадоў пражыла без мужа, што з’ехаў на Траянскую вайну, упраўлялася са справамі царскага дому і вырашала праблемы, звязаныя са сватаннем шматлікіх жаніхоў. Ва ўсіх трох раманах гераіні шукаюць уласны шлях у невыносных умовах існавання. М. Этвуд робіць гэтых трох гераінь апавядальніцамі ўласных гісторый (Фрэдава і Пенелопа – галоўныя гераіні-апавядальніцы, гісторыя, расказаная Грэйс Маркс пра сваё жыццё – гэта адна з сюжэтных ліній рамана) і ва ўсіх трох творах супрацьпастаўляе наратывам галоўных гераінь наратывы іншых персанажаў, ствараючы характэрны для постмадэрнісцкіх раманаў полінаратыў. Гісторыі галоўных гераінь не перабіваюцца іншымі галасамі, а дапаўняюцца імі, іх каштоўнасць не дэвальвуецца, аднак пад сумнеў ставіцца сама ідэя адзіна магчымага погляду на падзеі.

Раман “Гісторыя Служанкі” – гэта дыстопія, у якой наўпрост уздымаюцца пытанні, пастаўленыя другой хваляй фемінізму: праблемы гвалту (у тым ліку хатняга), мацярынства, роўных правоў жанчыны і мужчыны на рынку працы і перад законам. У Галаадзе і жанчыны, і мужчыны раздзеленыя на касты, кожная з якіх мае выконваць сваю ролю, і жаночыя ролі звязаныя з абслугоўваннем прывілеяваных сем’яў (Марфы), рэпрадуктыўным і сэксуальным абслугоўваннем чыноўнікаў высокага рангу (Служанкі і Езавелі) і абслугоўваннем сямейных гаспадарак больш нізкага ўзроўню (Эканажонкі). Пэўную ўладу (але толькі над іншымі жанчынамі) маюць Жонкі – спадарожніцы чыноўнікаў-Камандораў і Цёткі – супрацоўніцы Цэнтраў, дзе Служанкі рыхтуюцца да выканання сваіх функцый. Т. Я. Камароўская, аналізуючы раман “Гісторыя Служанкі”, называе гэтую групу персанажаў “жанчынамі, што здрадзілі свайму полу” [2, с. 10], бо менавіта пры іх падтрымцы было магчымае ўсталяванне галаадскай дыктатуры.

Кожная каста мае сваю ўніформу пэўнага колеру, і колер Служанак – чырвоны – выдзяляе іх з натоўпу і робіць бачнымі, прыцягваючы ўвагу да іх рэпрадуктыўнай функцыі. Гэтая каста – і прывілеяваная, і пагарджаная адначасова, бо целы яе прадстаўніц – гэта каштоўнасць, якая належыць грамадству і не належыць самім жанчынам. Служанка, якая мусіць праходзіць праз прыніжальную “Цырымонію” апладнення Камандорам і, нарадзіўшы дзіця, не мае на яго ніякіх правоў, – гэта вобраз

[17] Расійская даследчыца Святлана Ахотнікава вызначае паняцце “гендарная паэтыка” наступным чынам: “Гендарная паэтыка — гэта частка гістарычнай паэтыкі, распрацоўка якой стаіць у шэрагу першачарговых задач сучаснай навукі пра літаратуру. Прадметам дадзенага віду паэтыкі з’яўляецца *гендар* [курсіў аўтаркі артыкула — *Г. Я.*], які выступае не ў якасці біялагічнага полу, а як сукупнасць сацыяльных рэпрэзентацый, “культурная маска полу” у межах тых ці іншых сацыякультурных уяўленняў, што замацаваліся ў дадзеным грамадстве” [1].



polotsk.su

жанчыны, якая ў найвышэйшай ступені адчужаная ад уласнага цела, і гераіня рамана, Фрэдава, аказаўшыся ў такіх умовах, шукае ратунку праз расказванне сваёй гісторыі, прагаворванне ўсяго, што адбываецца з яе целам, такім чынам вяртаючы сабе ўладу над ім. Сярод іншых стратэгіяў, якія выкарыстоўваюцца жанчынамі ў Галаадзе для змагання са сваім становішчам – гэта ўцёкі, самагубствы і недазволеныя сяброўскія і любоўныя стасункі.

Крытыкі звязваюць зварот М. Этвуд да тэмы таталітарнага кантролю над грамадствам і перадусім над жанчынамі з палітыкай прэзідэнта ЗША рэспубліканца Роналда Рэйгана, падчас кіравання якога пашырыўся ўплыў рэлігійных кансерватыўных рухаў, што крытыкавалі дасягненні “сэксуальнай рэвалюцыі” 1960-70х гг. і другой хвалі фемінізму (сярод іх — даступнасць кантрацэптываў і ўзмацненне жаночых галасоў на палітычнай арэне). Сама пісьменніца неаднаразова падкрэслівала, што, задумаўшы раман, яна пастанавіла апісваць у ім толькі тыя рэпрэсіўныя практыкі ў дачыненні да жанчын, якія сапраўды мелі месца ў той ці іншы перыяд развіцця чалавецтва, – і многія з іх былі характэрныя для заходняй цывілізацыі і хрысціянскай культуры. Такім чынам, своеасаблівы падыход да стварэння жаночых вобразаў у рамане “Гісторыя Служанкі” тлумачыцца жаданнем пісьменніцы паказаць дзеянне гендарных стэрэатыпаў у экстрэмальных умовах, калі адна група людзей (у дадзеным выпадку – рэлігійных фундаменталістаў) атрымлівае ўладу над усім грамадствам.

У гістарыяграфічным метарамане “Яна ж Грэйс” М. Этвуд звяртаецца да гісторыі нашумелага забойства заможнага землеўласніка Томаса Кініра і яго ахмістрыні і каханкі Нэнсі Мантгомеры конюхам Джэймсам Макдэрматам і шаснаццацігадовай служанкай Грэйс Маркс, а праз гісторыю забойства – да гісторыі ірландскіх жанчын ніжэйшага класа, што ў XIX ст. масава эмігравалі са сваімі сем’ямі ў ЗША і Канаду. У рамане пісьменніца стварае шэраг жаночых вобразаў з рознымі жыццёвымі сцэнарамі – паспяховае замужжа і шчаслівае сямейнае жыццё (цётка Грэйс Полін), няўдачнае замужжа і, адпаведна, жыццё, поўная цяжкай працы і нягод (маці Грэйс), няўдалая рамантычная сувязь, якая прывяла да цяжарнасці, аборту і заўчаснай смерці (сяброўка Грэйс Мэры Уітні) – паказваючы, як мала магчымасцяў мела жанчына ніжэйшага класа і як моцна яна залежала ад добрай волі, матэрыяльнага дастатку, сэксуальных жаданняў мужчын (мужа, гаспадара, каханка). Зварот да гістарычнай тэмы – да асэнсавання жаночай версіі гісторыі, што супярэчыць той гісторыі, якую пішуць мужчыны, да гісторыі паўсядзённасці і несправядлівасці – гэта новы этап у творчасці М. Этвуд, чые творы дагэтуль былі прысвечаныя праблемам сучаснасці. Аднак, як адзначае Марына Варанцова, “гэта ўсяго толькі іншая форма, увасабленне нейкіх сутнасных праблем сучаснага пісьменніцы чалавека, што знаходзіцца ў пошуку самога сябе” [3, с. 93].

М. Этвуд зацікавілася асобай Грэйс Маркс дзякуючы кнізе канадскай пісьменніцы Сюзаны Мудзі “Жыццё на вырубках” (1853) і некалькі разоў звярталася да яе гісторыі ў сваіх творах. У пасляслоўі да рамана “Яна ж Грэйс” М. Этвуд адзначае, што “стаўленне да яе [Грэйс Маркс – *Г.Я.*] адлюстроўвала тагачаснае двухсэнсавае ўяўленне пра жаночую прыроду” [4, с. 538] – абвінавачаная магла быць як злачынцай і спакушальніцай, так і нявіннай ахвярай. Для таго, каб стварыць вобраз Грэйс Маркс і расказаць сваю версію яе гісторыі, М. Этвуд працавала ў архівах і вывучала газеты, што выходзілі ў Канадзе ў той час, калі было здзейснена забойства. У пасляслоўі да рамана пісьменніца адзначыла: “Я, канечне, белетрызавала гістарычныя падзеі (як гэта зрабілі многія каментатары, сцвярджаючы пры гэтым, што пішуць гісторыю). Я не змяніла ніводнага з прызнаных фактаў, хаця пісьмовыя крыніца настолькі супярэчлівыя, што вельмі нямногія факты можна без сумнення назваць “прызнанымі” <…>. Калі я вагалася, то спрабавала выбраць найбольш верагодны варыянт ці прымірыць усе варыянты, дзе гэта было магчыма. Там жа, дзе ў запісах сустракаліся адно намёкі і відавочныя прабелы, я свабодна дадумвала тое, чаго не хапае” [4, с. 541-542]. Абапіраючыся на рэальныя дакументы, М. Этвуд стварыла вобраз жанчыны, што спрабуе зразумець сваю ролю ў нашумелых падзеях, асэнсаваць свой лёс, прымірыцца з ім і прыняць яго. Працэс аповеду тут таксама мае вялікае значэнне: расказваючы пасля доўгіх гадоў турэмнага зняволення пра сваё мінулае, Грэйс Маркс не раскрывае альбо не можа раскрыць усе дэталі забойства, але шукае сябе ў тым патоку супярэчлівай інфармацыі, якая з’явілася пра яе ў прэсе ў час расследавання і наступныя гады. Яна, як і Фрэдава, не належыць сабе, і толькі расказваючы сваю гісторыю, можа вярнуць уладу над уласным жыццём. Таму для яе так важны слухач – доктар Джордан, нягледзячы на яго няздольнасць пранікнуць у яе свет і разгадаць яго загадку, і менавіта таму, выйшаўшы з турмы, яна складвае ў галаве адрасаваны яму ліст, каб завяршыць сваю гісторыю.

У аповесці “Пенелапіяда” М. Этвуд звяртаецца да другаснага вобраза са старажытнагрэцкай паэмы “Адысея” – Пенелопы, рэканструюючы падзеі, якія ў паэме замоўчваліся, і пераасэнсоўваючы міф, у якім жанчыне адводзілася маргінальнае месца. Пісьменніца робіць другасным героем самога Адысея, выносячы на першы план штодзённае жыццё яго жонкі і выбудоўваючы яе жаночы свет, цэнтральнае месца ў якім займала побытавая праца, супрацьпастаўлены свету мужчынскаму, дзе галоўнымі былі войны, падарожжы і любоўныя прыгоды, недазволеныя жанчынам. Пенелопа ў М. Этвуд аказваецца ўсёведным персанажам:

PolotskSU

аповед пра сваё жыццё яна вядзе з падземнага царства Аіда, адкуль назірае за падзеямі на зямлі, і таму яе пазіцыя – гэта пазіцыя жанчыны, якая бачыць усіх наскрозь і ўсё разумее; эпітэты "мудрая" і "разумная", якімі яна характарызавалася ў "Адысеі", атрымліваюць тут новы сэнс. Пенелопа ў рамане робіцца закладніцай жыццёвага выбару свайго мужа, аднак уздымаючы ў аповесці праблему ўлады, М. Этвуд вяртаецца да той тэмы, што закранался ў рамане "Гісторыя Служанкі": тэмы ўлады жанчын над іншымі жанчынамі. Пенелопа, гэтак жа як Цёткі і Жонкі, мае ўладу над іншымі – над рабынямі, – і таксама гэтай уладай злоўжывае. Выконваючы загад быць вачыма і вушамі сваёй гаспадыні сярод жаніхоў, дзяўчаты-рабыні цярпяць сэксуальны гвалт, а пасля, абвінавачаныя ў здрадзе царскаму дому, гінуць ад рукі Адысея і яго сына Тэлемаха. М. Этвуд дае ў аповесці голас не толькі Пенелопе, але і гэтым рабыням, прадстаўніцам ніжэйшага сацыяльнага класу, якія мелі яшчэ менш правоў на ўласную гісторыю, чым сама Пенелопа, дачка цара Спарты і жонка цара Ітакі.

У пасляслоўі да "Пенелапіяды" М. Этвуд згадвае працы, якія яна выкарыстоўвала для стварэння вобразаў у аповесці, – перадусім гэта сама "Адысея" Гамера і кніга "Грэцкія міфы" Роберта Грэйвза. Аднак у адрозненне ад вобраза Грэйс Маркс, які ствараўся на аснове дэтальна вывучаных архіўных дакументаў, вобраз Пенелопы распрацоўваўся больш вольна. Пісьменніца робіць яе самарэфлексіўным персанажам, што аспрэчвае свой кананічны вобраз, створаны Гамерам у "Адысеі", і праз расказванне сваёй гісторыі ўзнаўляе справядлівасць і выкрывае сутнасць усіх герояў старажытнагрэцкага эпасу – Адысея, Алены Траянскай, жаніхоў. Змена перспектывы кардынальна мяняе характар міфа, які з гераічнай гісторыі пра подзвігі Адысея і пра верную жонку, што чакала яго дваццаць гадоў, ператвараецца ў гісторыю выжывання жанчыны, якую муж пакінуў на волю лёсу.

Такім чынам, ва ўсіх трох творах М. Этвуд адлюстроўваецца досвед выжывання жанчыны ў мужчынскім свеце. Жанчыны вымушаныя жыць у залежнасці ад мужчын, не належаць самім сабе і спрабуюць выжыць і захаваць цэльнасць, расказваючы свае гісторыі. Раман "Гісторыя Служанкі" – гэта папярэджанне пра магчымыя наступствы прынятых у грамадстве рашэнняў і накладзеных на жанчын абмежаванняў; вобраз Фрэдавай – гэта вобраз максімальна адчужанай ад уласнага цела жанчыны, які выбудоўваецца ў адпаведнасці з пастаўленай задачай — паказаць лёс жанчыны ў таталітарным грамадстве. Раман "Яна ж Грэйс" даследуе псіхалогію жанчыны, якая не мае права на свабоду і на ўласнае жыццё і спрабуе разабрацца, кім яна насамрэч ёсць. Гэты вобраз аўтарка стварае на аснова сапраўдных гістарычных дакументаў, узнаўляючы ўмовы жыцця жанчыны ніжэйшага класа ў XIX ст. і пераасэнсоўваючы гісторыю з жаночага гледзішча. У рамане "Пенелапіяда" робіцца жаночая рэвізія старажытнагрэцкага міфа пра Адысея, у якім жанчыны займаюць маргінальнае месца, і даследуюцца магчымасці змены перспектывы. Пісьменніцу цікавіць тэма падвойных стандартаў у адносінах да людзей розных полаў і класаў. Вобраз Пенелопы выбудоўваецца на аснове звестак, пададзеных у міфах, і пазнейшых даследаванняў, аднак аўтарка робіць сваю гераіню ўсёведнай і самарэфлексіўнай, што дапамагае вывесці аповед за межы міфа і зрабіць яго ўніверсальным.

ЛІТАРАТУРА

1. 1. Охотникова, С. Гендерные исследования в литературоведении: проблемы гендерной поэтики/С. Охотникова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.a-z.ru/women_cd1/html/gender_issledovanija_v_literature.htm. – Дата доступа: 24.10.2016.
2. Комаровская, Т. Е. Феминистская литература США: обретения и потери на пути к самоидентификации/Т. Е. Комаровская//Вопросы германской филологии и методические инновации в обучении и воспитании : материалы ИХ респуб. науч.-практ. конф., Брест, 25 марта 2005 г./Редкол. А. Н. Гарбалев и др. – Брест : Изд-во БрГУ, 2005. – С. 3-11.
3. Воронцова, М. Историографичный роман М. Этвуд «Под именем Грейс» как репрезентация современного этапа творчества писательницы/М. Воронцова//Американские исследования: Ежегодник, 2004-2005/Под ред. Ю. В. Стулова. – Минск: Пропилеи, 2006. – С. 89-93.
4. Atwood, M. Alias Grace/M. Atwood. – London: Virago Press, 2004. – 545 p.